# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

25 мая 2021 г. № 198 г.Мінск

Аб устанаўленні юбілейнага
медаля

У азнаменаванне 100-годдзя ўтварэння сістэмы эканамічных органаў Беларусі:

1. Установіць юбілейны медаль ”100 год беларускім эканамічным органам“.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб юбілейным медалі ”100 год беларускім эканамічным органам“, яго апісанне і ўзор пасведчання да гэтага медаля (прыкладаюцца).

3. Фінансаванне расходаў на выраб юбілейных медалёў ”100 год беларускім эканамічным органам“ і пасведчанняў да іх ажыццявіць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Міністэрства эканомікі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

11

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.05.2021 № 198

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб юбілейным медалі ”100 год беларускім эканамічным органам“

1. Юбілейным медалём ”100 год беларускім эканамічным органам“ (далей – юбілейны медаль) узнагароджваюцца работнікі Міністэрства эканомікі за плённую працу і значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.

Юбілейным медалём за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь таксама могуць узнагароджвацца:

ветэраны Міністэрства эканомікі (у тым ліку работнікі Дзяржаўнага планавага камітэта БССР, Дзяржаўнага камітэта па эканоміцы і планаванні БССР, Дзяржаўнага камітэта па эканоміцы і планаванні Рэспублікі Беларусь), работнікі камітэтаў эканомікі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама;

іншыя асобы, якія актыўна супрацоўнічалі з Міністэрствам эканомікі ў мэтах выканання задач па дасягненні ўстойлівага, збалансаванага эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі і дабрабыту насельніцтва краіны.

2. Узнагароджанне юбілейным медалём ажыццяўляецца Міністрам эканомікі.

3. Юбілейны медаль уручаецца Міністрам эканомікі або па яго даручэнні намеснікамі Міністра эканомікі.

4. Асобам, узнагароджаным юбілейным медалём, выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору.

5. Аб праведзеным уручэнні складаецца пратакол, які падпісвае асоба, якая ўручае юбілейны медаль. Пратакол захоўваецца па месцы ўручэння юбілейнага медаля.

6. Юбілейны медаль носіцца на цывільным адзенні на левым баку грудзей і пры наяўнасці іншых медалёў размяшчаецца пасля юбілейнага медаля ”100 год органам дзяржаўнага кантролю Беларусі“. Паўторнае ўзнагароджанне юбілейным медалём не ажыццяўляецца. Дублікаты юбілейнага медаля і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.05.2021 № 198

АПІСАННЕ
юбілейнага медаля ”100 год беларускім эканамічным органам“

Юбілейны медаль ”100 год беларускім эканамічным органам“ (далей – юбілейны медаль) вырабляецца з металу залацістага колеру (латунь) і мае форму круга дыяметрам 33 мм. Краі юбілейнага медаля абведзены борцікам.

Вонкавы бок юбілейнага медаля ўяўляе сабой круг залацістага колеру, у центры якога знаходзіцца стылізаваная выява зямнога шара фіялетавага колеру на светла-шэрым фоне з паралелямі і мерыдыянамі светла-шэрага колеру. У цэнтры выявы зямнога шара размешчаны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь серабрыстага колеру з аблямоўкай фіялетавага колеру. Унутры контуру – стылізаваная слупкаватая дыяграма ў выглядзе дзевяці вертыкальных прамавугольнікаў белага колеру, абмежаваных зверху лініяй фіялетавага колеру, якая ўяўляе сабой па форме графік экспаненты і заканчваецца стрэлкай, накіраванай направа і ўверх.

Серабрыстая аблямоўка абмежавана лініямі фіялетавага колеру. У верхняй частцы аблямоўкі размешчана выява беларускага арнаменту чырвонага колеру, у ніжняй – надпіс фіялетавага колеру ”МІНІСТЭРСТВА ЭКАНОМІКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ“.

У верхняй частцы аблямоўкі залацістага колеру размешчаны надпіс ”100 ГОД БЕЛАРУСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ ОРГАНАМ“ таго ж колеру, у ніжняй – вянок лаўра залацістага колеру.

На адваротным баку юбілейнага медаля ў цэнтры размешчаны надпіс ”1921 – 2021“ залацістага колеру. Па аблямоўцы юбілейнага медаля – вянок лаўра залацістага колеру.

Юбілейны медаль пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з пяцівугольнай алюмініевай калодкай, на якой размешчана муаравая стужка фіялетавага колеру шырынёй 24 мм з дзвюма падоўжнымі палоскамі па баках, выкананымі ў колерах Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь, шырынёй 2 мм кожная і палоскай залацістага колеру пасярэдзіне шырынёй 4 мм.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.05.2021 № 198

# УЗОР
пасведчання да юбілейнага медаля ”100 год беларускім эканамічным органам“



РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

ПАСВЕДЧАННЕ

ДА ЮБІЛЕЙНАГА МЕДАЛЯ

”100 ГОД БЕЛАРУСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ ОРГАНАМ“



Загадам Міністра эканомікі
Рэспублікі Беларусь
ад ”....“ ..................... 20..... года
№ ..........

УЗНАГАРОДЖАНЫ(А)
ЮБІЛЕЙНЫМ МЕДАЛЁМ

”100 ГОД БЕЛАРУСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ ОРГАНАМ“

Міністр эканомікі
Рэспублікі Беларусь

М.П.